ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 18 (813) ● Чацвер, 13 мая 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

РАШЭННІ XXIV З'ЕЗДА КПСС—У ЖЫЦЦЁ

## З КЛОПАТАМІ АБ БУДУЧЫМ

Усесаюзны камсамольскі сход ва універсітэце завяршылі геафакаўцы. 10 мая яны сабраліся на факультэце, каб абмеркаваць свае камсамольскія справы. З дакладам «Аб задачах камсамольскіх арганізацый у святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС» выступіла намеснік сакратара партбюро па палітыка-выхаваўчай рабоце Е. М. Русакова.

Затым слова ўзялі сакратары камсамольскіх бюро курсаў М. Прашкевіч (I к.), Л. Дзямідовіч (IV к.), Т. Баркун (IV к.), М. Дубісаў (II к.) і член камітэта камсамола Т. Пяткевіч (II к.). Яны расказалі, як прайшоў Ленінскі залік на факультэце, гаварылі аб задачах, якія неабходна вырашыць, указалі на недахопы ў камсамольскай рабоце.

На сходзе былі вызначаны лепшыя групы факультэта: I група эканомгеаграфаў (куратар Л. А. Паўловіч) і I група III курса фізгеографаў (куратар М. В. Лаўрыновіч). Метады работы гэтых камсамольскіх груп могуць быць узяты за прыклад.

Камсамольцы прынялі пастанову, у якой намечана палепшыць камсамольскую работу, стварыць вучэбную камісію (у саставе членаў камітэта камсамола і лепшых студэнтаў факультэта). У яе абавязкі ўваходзіць сачыць за паспяховасцю, дапамагаць адстаючым.

Асаблівую ўвагу камсамольцы вырашылі звярнуць на выкананне планаў, рашэнняў і пастаноў камсамольскіх сходаў, а таксама на паляпшэнне работы студэнцкіх навуковых гурткоў.

У заключэнне выступіў сакратар партбюро факультэта М. К. Чартко. Ён спыніўся на пытаннях паспяховасці, выказаў меркаванні аб паляпшэнні ідэалагічнай, арганізацыйнай работы і ўдзеле камсамольцаў у прапагандзе рашэнняў з'езда сярод насельніцтва на месцы праходжання практыкі.

**М. МАЦЕЙКА.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За высокія працоўныя дасягненні, актыўную работу ў прафсаюзах і ў сувязі з 50-годдзем першага Усебеларускага з'езда прафсаюзаў Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР:

**МІХАЙЛАЎ Арсеній Міхайлавіч — дацэнт кафедры гісторыі КПСС, член Белсаўпрофа.**

**ЛІТВІНКА Васіль Дзмітравіч — старшыня праўлення студэнцкага клуба.**

**РАГОЎСКІ Іван Трыфанавіч — дацэнт кафедры палітэканоміі, намеснік старшыні мясцкома.**

**Граматай Вярхоўнага Савета БССР:**

**БАРАНАВА Марыя Парфіраўна — дацэнт гістфака, член БРК прафсаюза.**

**ДУЮН Васіль Пятровіч — ст. выкладчык юрфака, няштатны выкладчык прафсаюзных курсаў Белсаўпрофа.**

## ВУЧОНЫЯ— ПРАЦАЎНІКАМ СЯЛА

Вось ужо другі год калектыў гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна шэфствуе над нашым раёнам. Пачатак каштоўнай ініцыятыве паклаў ветэран старэйшай навуковай установы рэспублікі кандыдат фізіка-матэматычных навук М. Я. Рэзнікаў. Ён першым з калектыву вучоных універсітэта быў жаданым госцем у сельскіх працаўнікоў Стаўбцоўскага раёна. Лекцыю «Навука і тэхніка ў свеце будучага» з вялікім задавальненнем праслухалі механізатары будаўніча-мантажнага ўпраўлення, настаўнікі і навучэнцы старэйшых класаў сярэдніх школ нашага горада і вёскі Дзяроўная, вадзіцелі аўтатранспарту і рабочыя пладова-гароднінная завода і многія іншыя.

Вялікую метадычную дапамогу ў выкладанні гісторыі і грамадазнаўства аказаў кандыдат гістарычных навук У. Н. Сідарцоў. Ён у пачатку 1971 года выступіў перад настаўнікамі школ нашага раёна з лекцыямі «Сучасная перыядызацыя гісторыі савецкага грамадства» і «Навейшая гісторыяграфія Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў».

Зусім нядаўна мы цёпла прымалі групу вучоных і студэнтаў гістарычнага факультэта, якую ўзначальваў сакратар партбюро факультэта Э. М. Загарульскі. Госці пабывалі ў калгасе імя Янкі Купалы. Тут доктар гістарычных навук Г. М. Ліўшыц на тэматычным вечары выступіў з лекцыяй «Паходжанне хрысціянства». З вялікай увагай настаўнікі і навучэнцы Рубяжэвіцкай сярэдняй школы праслухалі лекцыю студэнта V курса філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта В. С. Наважылава «Белдзяржуніверсітэту імя У. І. Леніна—50 гадоў». Студэнты парадавалі хлебаробаў цікавым і змястоўным рэпертуарам мастацкай самадзейнасці.

Сардэчна быў сустрэты хлебаробамі калгаса «Чырвоная зорка» кандыдат філасофскіх навук В. Я. Молакаў. Тут ён выступіў з лекцыямі «Сучаснае рускае праваслаўе», «Навука і рэлігія аб смерці і бессмяротнасці чалавека». Як старшыня навукова-метадычнага савета пры праўленні Мінскай абласной арганізацыі таварыства «Веды» тав. Молакаў аказаў метадычную дапамогу нашай раённай арганізацыі таварыства «Веды» ў планаванні, выпрацоўцы форм і метадаў атэістычнай прапаганды.

З лекцыяй «Эканамічныя сувязі СССР з зарубежнымі краінамі» перад хлебаробамі калгаса «Праўда» выступіла кандыдат эканамічных навук Г. І. Аляхновіч.

Цяпер паўсюдна шырока разгарнулася растлумачэнне рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КП Беларусі. І ў гэтую вялічную работу нашых партыйных арганізацый шэфы ўнясуць свой пэўны ўклад. Яны плануюць неўзабаве зноў наведаць наш раён, выступіць перад працаўнікамі з лекцыямі і дакладамі, дапамагчы данесці да глыбокай свядомасці мас велічныя прадвызначэнні партыі на новым этапе камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

**А. ТРАЯНОВІЧ,**
**адказны сакратар праўлення раённай арганізацыі таварыства «Веды».**

## СПРАВАЗДАЧА РЭКТАРАТУ

На ўсіх факультэтах ідзе падрыхтоўка да юбілейных універсітэцкіх урачыстасцей.

Аб тым, што зроблена па выкананню планаў падрыхтоўкі да 50-годдзя БДУ, на чарговым пасяджэнні рэктарата дакладваў дэкан юрыдычнага факультэта В. А. Шкурко і намеснік дэкана факультэта журналістыкі А. І. Раковіч.

У калектыве юрыдычнага факультэта прайшлі курсавыя камсамольскія сходы, пасяджэнні кафедр, на якіх гутарка ішла аб дастойнай сустрэчы юбілею БДУ. Зацверджан план юбілейных выставак і вядзецца падбор матэрыялаў, афармляюцца стэнды, асаблівая ўвага звернута на паляпшэнне паспяховасці і дысцыпліны студэнтаў.

Рэалізуюцца планы факультэта журналістыкі па арганізацыі выставак, гутарак і выступленняў выкладчыкаў і студэнтаў па юбілейнай тэматыцы. Упрыгожыць факультэт шэраг стэндаў і галоўны сярод іх—«Ленін і друк». Рыхтуецца навуковая сесія з удзелам студэнтаў. Да святочных дзён выйдуць юбілейныя нумары факультэцкай і курсавых насценных газет.

На наступных пасяджэннях рэктарата справаздачу зробяць прадстаўнікі іншых факультэтаў.

У гэты ж дзень дэкан М. А. Пашкевіч дакладваў аб рабоце факультэта па павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Загадчык аддзела вытворчай практыкі У. Д. Мухаеў расказаў аб выніках работы навукова-метадычнай канферэнцыі па вытворчай і педагагічнай практыцы.

## СТУДЭНТЫ-ЛЕКТАРЫ

У пачатку сёлетняга семестра на факультэце прыкладной матэматыкі створана студэнцкая лектарская група. Кіруе ёю дацэнт кафедры палітэканоміі А. Я. Бураўскі. У састаў групы ўвайшло 40 студэнтаў I—IV курсаў. Большасць сярод іх — чацвёртакурснікі.

На першым пасяджэнні, якое адбылося ў лютым, быў распрацаван канкрэтны план. Зараз студэнцкая лектарская група працуе ў асноўным у трох напрамках: прапаганда рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ, падрыхтоўка і чытанне лекцый, дакладаў, прысвечаных 50-годдзю універсітэта, распрацоўка спецыяльнай тэматыкі і выступленне з лекцыямі аб факультэце прыкладной матэматыкі.

Многія студэнты актыўна ўключыліся ў работу студэнцкай лектарскай групы. Аб гэтым сведчаць цікавая тэматыка і змястоўныя даклады, прачытаныя на студэнцкай навуковай канферэнцыі, прысвечанай ленінскім дням. Даклады Зелянкова «Уплыў агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі рабочых на рост прадукцыйнасці працы» (IV курс), Жагло «Ленін і планаванне народнай гаспадаркі» (IV курс), Фрыдзені «Роля матэматыкі ў сістэме прыродазнаўчых навук», Халадзілінай «У. І. Ленін аб моладзі» (I курс), Катлінскай «Ленін аб рэжыме эканоміі і беражлівасці ў народнай гаспадарцы» (I курс) выклікалі зацікаўленасць у слухачоў.

Рэгулярна праходзяць пасяджэнні групы, на якіх мы абмяркоўваем даклады, вучымся лектарскаму майстэрству. Студэнткі IV курса Л. Ліннік і Л. Маляўка атрымалі лектарскія пуцёўкі ЦК ЛКСМБ і выступяць у раёнах рэспублікі.

Бліжэйшая задача лектарскай групы — дабіцца, каб кожны на працягу мая — жніўня выступіў не менш двух разоў у школах, калгасах, саўгасах, у студэнцкіх будаўнічых атрадах.

**Л. РАМАНЧУК,**
староста студэнцкай лектарскай групы ФПМ.

«Прагрэс навукі і тэхнікі—гэта галоўны рычаг стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму. Вось чаму ў такім важнейшым пытанні, як развіццё навукі і тэхнікі, мы выразна бачыць перспектывы, улічваць іх у практычнай рабоце».

(З даклада Л. І. Брэжнева на XXIV з'ездзе КПСС).

## ЗАТРАТЫ АПРАЎДАЮЦЬ СЯБЕ

У навучанні даўно выкарыстоўваюцца тэхнічныя сродкі: кіно, радыё, тэлебачанне, розныя трэнажоры і г. д. Аднак толькі сістэма праграміраванага навучання дае магчымасць найбольш блізка падысці да вырашэння праблемы аўтаматызацыі працэсу навучання. Тэхнічныя сродкі для праграміраванага навучання здзяйсняюць індывідуалізацыю вучэбнага працэсу адпаведна прынцыпам праграміраванага навучання. У цяперашні час прынята раздзяленне гэтых канструкцый на клас машын, рэгулюючых працэс навучання, на клас машын кантралюючых, г. зн. правяраючых і ацэньваючых засваенне, і клас камбініраваных канструкцый.

З дапамогай навучаючых машын можна арганізаваць самастойную работу па набыццю ведаў, уменняў, навыкаў, так як машына падае навучэнцам некаторую інфармацыю і кіруе выкананнем імі вучэбнага задання, пабудаванага па прынцыпах праграміраванага навучання.

Выходзячы з сучасных псіхолага-педагагічных патрабаванняў да тэхнічных сродкаў праграміраванага навучання, у навучаючых машынах, па-першае, павінен абавязкова прадугледжвацца абмен інфармацыяй паміж навучаемым і машынай і, наадварот, па-другое, павінен улічвацца індывідуальны тэмп успрыняцця інфармацыі. Клас кантралюючых машын, у прыватнасці «экзаменатараў», робіць праверку і ацэнку ведаў.

Тэхнічныя сродкі праграміраванага навучання павінны адпавядаць розным патрабаванням навучальнага працэсу. Так, у выкладанні фізікі, хіміі патрэбны навучаючыя машыны, якія маглі б паказаць дынаміку з'яў, таму ў гэтых машынах пажаданы праграмна кіруемы кінапраектар. Для іншых прадметаў (гісторыя,

(Заканчэнне на 2-й стар.)



Студэнты хімічнага факультэта асвойваюць новую методыку храматаграфічных метадаў даследавання рэчываў.

Фота **Л. Калюжнай.**

# ЗАТРАТЫ АПРАЎДАЮЦЬ СЯБЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

геаграфія, літаратура) дастаткова дзіапраектара. Моўныя дысцыпліны патрабуюць вуснай размовы з навучаючым уладкаваннем, таму ў ім пажаданы магнітафон.

Лабараторыя тэхнічных сродкаў для праграміраванага навучання ў БДУ працуе з 1964 года. Спачатку яна была абсталявана 15-ю кантралюючымі машынамі «Ластаўка», а з 1967 года— і аўтаматызаваным класам АК-15, у састаў якога ўвайшлі 15 навучаючых машын «Мінчанка» і пульт выкладчыка. Абодва тыпы машын размяшчаліся ў адной цеснай аўдыторыі.

Прайшло некалькі год, аднак становішча амаль не змянілася. Па-ранейшаму ўсе машыны (да іх прыбавілася яшчэ 10 тэлетайпаў мнагапультавай вылічальнай сістэмы, што ўяўляе сабой навучаючы комплекс, распрацоўваемы ў нашым універсітэце) знаходзяцца ў адной, хоць, праўда, некалькі большай аўдыторыі.

Нагрузка на навучаючыя і кантралюючыя машыны, асабліва ў час практычных заняткаў і сесій, вельмі вялікая. Колькасць машын менш сярэдняга ліку студэнтаў у групе. Вялікі шум, шматлюддзе, асабліва калі адначасова працуюць «Мінчанкі» і тэлетайпы, робяць заняткі непрадукцыйнымі.

У цяперашні час машыны ўстарэлі, часта выходзяць са строю. Рамонт, абслугоўванне машын, падрыхтоўка заданняў, білетаў і іншае выконваецца загадчыкам лабараторыі і лабарантам. Мала ўвагі ўдзяляецца методыцы складання навучаючых праграм — аснове асноў праграміраванага навучання.

Аднак, нягледзячы на ўсе гэтыя недахопы, за некалькі год работы класа накоплен вялікі вопыт правядзення практычных заняткаў (у прыватнасці, па вылічальных машынах і праграміраванню), семінараў і залікаў (геаграфія, фізіялогія, замежныя мовы, археалогія і іншыя). Важнай з'яўляецца і зацікаўленасць студэнтаў да такіх заняткаў. Гэты вопыт дазваляе гаварыць аб неабходнасці працягваць і пашыраць індывідуальнае навучанне і кантроль за ведамі студэнтаў з дапамогай тэхнічных сродкаў праграміраванага навучання.

Але ўсё гэта можа застацца толькі добрым пажаданнем, калі клас не будзе забяспечан новымі, адпавядаючымі сучасным патрабаванням праграміраванага навучання тэхнічнымі ўладкаваннямі і калі колькасць гэтых уладкаванняў не будзе роўнай хоць бы сярэдняй вучэбнай групе. Патрэбны таксама, па крайняй меры, дзве аўдыторыі, таму што размясціць у адной мінімум 20—25 навучаючых, 20—25 кантралюючых машын, 10 тэлетайпаў практычна немагчыма.

Наш універсітэт з'яўляецца адным з вядучых вну краіны. У гэтым годзе мы рыхтуемся адзначыць яго 50-годдзе. Многае зроблена і робіцца для дастойнай сустрэчы знамянальнай даты. Не павінна заставацца забытай і лабараторыя тэхнічных сродкаў праграміраванага навучання, якая пакуль знаходзіцца ў становішчы беднай сваячкі. Любыя затраты пры правільнай арганізацыі перадавых метадаў навучання, саманавучання і кантролю студэнтаў апраўдвалі і будуць апраўдваць сябе.

**А. ШУМЛЯЕВА,**
**загадчыца лабараторыі праграміраванага навучання.**

**РЫХТУЕМСЯ ДА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА**

# ТАК НАМ СЭРЦА ЗАГАДАЛА

— Дык, кажаце, у будаўнічы атрад збіраецеся падавацца?

— Так, так. Хочацца папрацаваць па-сапраўднаму, бліжэй пазнаёміцца з людзьмі, пасябраваць з вясковай моладдзю, — Чан В'ет Хунг змаўкае, кідаючы кароткі позірк на свайго сябра Нгуен В'ет Хунга.

Гэтыя юнакі з фізічнага факультэта сябруюць ужо каторы год, таму з паўслова разумеюць адзін аднаго. Нгуен В'ет Хунг працягвае думку сябра:

— Нашы бацькі гераічна змагаюцца ў родным В'етнаме, а мы хочам паказаць сябе героямі ў працы. (Імя Хунг у перакладзе з в'етнамскай мовы азначае «герой».) Дык вось, абодва юнакі і яшчэ каля 50 іх в'етнамскіх сяброў хочуць летам папрацаваць на будоўлях Беларусі. В'етнамскія студэнты лічаць сваім абавязкам прыняць удзел у працоўным семестры і такім чынам разам з савецкімі студэнтамі ўнесці свой уклад у фонд дапамогі гераічнаму В'етнаму: сёлета будаўнікі студэнцкіх атрадаў частку сродкаў адлічаць у фонд В'етнама.

У будаўнічы атрад жадалі трапіць многія. Але на камсамольскіх сходах у в'етнамскіх групах адабралі 50 найбольш моцных і здаровых юнакоў.

— Па рашэнню камітэта камсамола універсітэта, — гаворыць намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па інтэрнацыянальнай рабоце В. Кушнер, — групы в'етнамскіх студэнтаў былі далучаны да будаўнічых атрадаў матэматычнага і фізічнага факультэтаў.

— У гэтым годзе савецкія і в'етнамскія студэнты-будаўнікі, — расказвае намеснік начальніка штаба працоўных спраў У. Рассохін, — будуць працаваць у Бярэзінскім, Смалявіцкім, Вілейскім СМУ, на будаўніцтве новай воднай сістэмы Вілея—Мінскводбуд, у міжкалгасных будаўнічых арганізацыях на ўзвядзенні сельскіх клубаў, школ, вытворчых памяшканняў. Сумесная праца і адпачынак дазволяць ім яшчэ лепш пасябраваць, згуртавацца.

І калі зараз, па словах Чан В'ет Хунга, в'етнамскія юнакі ведаюць толькі некаторыя беларускія словы, такія, як «бульба», «дзякуй», то ў будаўнічым атрадзе яны навучацца беларускім песням, танцам, пазнаёмяцца яшчэ бліжэй з нацыянальнымі звычаямі беларускай вёскі.

**В. РАДКЕВІЧ,**
**студэнтка.**

# РЭЗЕРВЫ ПАСПЯХОВАСЦІ — ПОБАЧ

Які ён, выдатнік? Да чаго імкнецца, ад чаго адштурхоўваецца?

Такія пытанні задавалі сабе члены савета выдатнікаў, рыхтуючыся да другога універсітэцкага злёту. І сёння ёсць над чым паразважаць.

Даўно, ды і зараз бытуе меркаванне: «Выдатнікам можна быць толькі ў шкоду грамадскай дзейнасці. Выдатнік ужо тым, што добрасумленна вучыцца, прыносіць карысць». Абвергнуць такі погляд можна было толькі маючы абагульняючыя лічбы, а іх не існавала.

Прыйшлося правесці даследаванні на большасці факультэтаў. Сутыкнуліся з цікавымі фактамі. Сярод студэнтаў, якія здалі дзве сесіі запар на выдатна, на геаграфічным, хімічным, юрыдычным факультэтах не вядуць ніякай грамадскай работы адпаведна 70, 75, 77 працэнтаў. Праўда, значна лепшыя справы на факультэтах журналістыкі і прыкладной матэматыкі. А з усіх 556 выдатнікаў, якіх абследавалі, 288 чалавек, або 51 працэнт, заняты толькі вучобай. Відавочна, што адны, як кажуць, «сухары ад навукі», а другія ўсюды паспяваюць.

Асаблівай розніцы ў становішчы паміж такімі неаднолькавымі выдатнікамі не знойдзеце. Атрымоўваюць абавязкова павышаную стыпендыю, дыплом выдаецца і тым і гэтым у чырвонай вокладцы, на камісію па размеркаванню заходзяць першымі тыя, у каго лепшы сярэдні бал, а калі ён роўны, то па алфавіту. Зыходзячы з гэтага некаторыя прыходзяць да вельмі абмежаванага погляду: цягнуць «хвасцістаў», займацца грамадскай работай — дарэмная трата часу. Няхай грамадскія дзеячы карыстаюцца пашанай у калектыве ды слухаюць апладысменты на сходах, а наша хата з краю. Зразумела, так думаюць не ўсе. Ёсць і іншыя пункты гледжання. Здаецца, што не хапае ініцыятывы, і студэнт не можа сам знайсці ўчастак работы. Такіх таксама нямала.

Аднак мірыцца з фактам, што побач з 1201 выдатнікам ва універсітэце суседнічаюць 722 студэнты з дрэннымі адзнакамі, нельга.

Пры аналізе выявілася і такая тэндэнцыя: чым больш выдатнікаў удзельнічае ў грамадскай рабоце, тым вышэй сярэдні бал паспяховасці на факультэце. Вось яскравы прыклад. На журфаку амаль кожны выдатнік пабываў ці на сустрэчы з першакурснікамі, ці прымаў удзел у правядзенні кансультацый у час сесіі, ці аказваў добраахвотную дапамогу адстаючым. У выніку факультэт займае першае месца па паспяховасці ва універсітэце.

Аналагічная работа праводзілася акадэмічнымі сектарамі камітэтаў камсамола на іншых факультэтах. У хімікаў некаторыя выдатнікі з'яўляюцца камсамольскімі куратарамі груп, філолагі чыталі дадатковыя лекцыі і г. д. Аднак неабходнай увагі да гэтых важных спраў не праяўлялася.

Менавіта цяпер паўстае востра пытанне аб адносінах да працы, якая матэрыяльна не ўзнагароджваецца. На XXIV з'ездзе КПСС Л. І. Брэжнеў адзначыў, што адной з першых задач вышэйшай школы ёсць і будзе «выхаванне ў савецкіх людзях новых, камуністычных адносін да працы».

Калі вызначаліся рэзервы паспяховасці, перад камсамольскім і прафсаюзным актывам паўстала новая задача: «Кожнаму выдатніку— грамадскае даручэнне». Добра было б, калі б на праходзячых перавыбарах у грамадскіх арганізацыях улічваліся магчымасці студэнтаў-выдатнікаў і абавязкова даручаліся ім пэўныя ўчасткі грамадскай работы.

**А. МІХАЛЬЧАНКА.**

# ПЕРАД КАМІСІЯЙ— ДЫПЛОМНІКІ









Адказная пара абароны дыпломных работ... Яна аднолькава хвалюючая і для студэнтаў дзённага навучання, і для завочнікаў. Сёння перад камісіяй якраз выпускнікі філасофскага аддзялення завочнага факультэта.

НА ЗДЫМКАХ: абараняюць свае дыпломныя даследаванні Н. М. Шклёва і Л. Ц. Шычко.

Фота Д. Чаховіча.

## У ГОНАР ДНЯ ПЕРАМОГІ

На гістарычным факультэце адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 26-й гадавіне перамогі над фашысцкай Германіяй. З уступным словам выступіў дацэнт кафедры гісторыі БССР А. П. Ігнаценка. Было заслухана 15 дакладаў студэнтаў. Сярод іх «Абарона Магілёва» (Н. Бандарэвіч, II курс), «Камсамол і моладзь Гродзеншчыны ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў» (В. Лебецкі, III курс), «Камуністы Клічаўшчыны — арганізатары партызанскага руху» (Л. Махнач, III курс), «Шкода, якая была нанесена нямецка-фашысцкімі захопнікамі Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту» (Л. Дамінікін, IV курс), «Барацьба за стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі (Ю. Расказаў, V курс) і іншыя.

Дацэнт У. А. Ціток падвёў вынікі абмеркавання дакладаў, адзначыў іх вялікае навуковае і грамадскае значэнне. Лепшыя работы рэкамендаваны на рэспубліканскі агляд студэнцкіх навуковых работ.

НАШ КАР.

## НАВІНКІ ВЫДАВЕЦТВА БДУ

**В. И. Ленин** и художественная литература. Под ред. Л. И. Фигловской и др.

Артыкулы, якія складаюць гэтую кнігу, ахопліваюць шырокае кола пытанняў, прысвечаных праблеме «У. І. Ленін і пытанні літаратуры». Асноватворнае значэнне геніяльнага ленінскага вучэння аб літаратуры для развіцця мастацтва сацыялістычнага рэалізму, увасабленне вобраза У. І. Леніна у шматнацыянальнай савецкай літаратуры і творчасці прагрэсіўных зарубежных пісьменнікаў, распрацоўка У. І. Леніным класічнай літаратурнай спадчыны— такая праблематыка гэтага зборніка.

**Булацкий Г. В., Плавник А. А.** Луначарский — революционер - публицист (1905—1907 гг.).

Кніга прысвечана даследаванню публіцыстычнай дзейнасці А. В. Луначарскага перыяду першай рускай рэвалюцыі. Прасочваецца спроба пранікнуць у творчую лабараторыю літаратара, аналізуюцца асноўныя рысы і асаблівасці яго прафесійнага майстэрства.

**Короткая Л.** На путях к атеизму. (Антицерковная традиция в древнерусской литературе).

У кнізе прасочваецца станаўленне антыцаркоўнай традыцыі ў літаратуры XI — XVI стагоддзяў і сцвярджэнне яе ў дэмакратычнай сатыры XVII стагоддзя. Вызначаюцца прычыны, абумовіўшыя гэты працэс, паказана яго заканамернасць. Аналізуецца вялікая колькасць твораў, якія разглядаюцца у сувязі з канкрэтна-гістарычнымі умовамі жыцця рускага народа.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

## Да 50-годдзя БДУ імя У. І. Леніна

# ЁН БЫЎ НАШЫМ СТУДЭНТАМ

Уручаючы ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў сярод многіх слаўных імён, звязаных з гісторыяй нашай вну, назваў імя Я. У. Смушкевіча. Ці ўсім вядома, чаму прагучала ва ўрачысты для універсітэта час гэтае імя?

Калі сказаць, што палітрук мінскай авіячасці Я. У. Смушкевіч, атрымаўшы адукацыю на факультэце грамадскіх навук БДУ, стаў адным з першых двойчы Герояў Савецкай Краіны — значыць амаль нічога не сказаць аб гэтым цудоўным чалавеку. Аўтару гэтых радкоў пашчаслівілася сустрэцца з жонкай і дачкой, а таксама з баявымі саратнікамі героя — генерал-лейтэнантам А. С. Сенатаравым, генерал-маёрам Г. М. Пракоф'евым, палкоўнікам І. У. Пранішнікавым. Светлым і жывым застаўся ў памяці гэтых людзей вобраз аднаго з таленавітых камандзіраў Савецкай Арміі.

Якаў Уладзіміравіч Смушкевіч — выхадзец з беднай сям'і, рана пачаў працоўнае жыццё. Яшчэ хлапчуком дапамагаў бацьку, працаваў падручным пекара, грузчыкам. У 1918 годзе ва ўзросце 16 год уступіў у партыю бальшавікоў, быў актыўным удзельнікам грамадзянскай вайны. Нягледзячы на маладосць, ён карыстаўся аўтарытэтам сярод чырвонаармейцаў. У 1922 годзе Я. У. Смушкевіч быў назначан палітруком авіязлучэння ў Мінску. Хутка ён паступае на прававое аддзяленне факультэта грамадскіх навук БДУ, не пакідаючы службы ў эскадрыллі. Ці варта гаварыць аб тым, як цяжка даводзілася баявому камандзіру, не маючаму нават школьнай адукацыі, асвойваць універсітэцкі курс. У заяве рэктару універсітэта У. І. Пічэце Смушкевіч пісаў: «Прашу даць мне скарочаны калёквіум з адтэрміноўкай на некаторы час, таму што, знаходзячыся ў Чырвонай Арміі з 1918 года, з-за няспыннай працы і некаторых жыцейскіх узрушэнняў, як перажыванне моцных катаванняў на працягу гадавога палону, двух раненняў, мне надзвычай цяжка будзе здаць поўны калёквіум, тое ж самае і скарочаны ў бліжэйшыя дні.

19.IX.1923 г. Прасіцель Смушкевіч».

І ўсё ж ён з выдатнымі адзнакамі здаў у першым годзе вучобы экзамены па дыялектычнаму матэрыялізму, палітэканоміі, гісторыі народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі, навейшай гісторыі Заходняй Еўропы, гісторыі сацыялізма, беларускай і нямецкай мовах. У той жа час палітрук самастойна вучыўся лятаць. Праз некалькі год самавучка стаў класным лётчыкам і быў назначан камандзірам Віцебскай авіябрыгады. Толькі ў 1932 годзе на працягу 39-дзённага водпуску ён прайшоў двухгадовы курс Качынскай лётнай школы.

«На першае месца з лётнага саставу ў трыццатыя гады я б паставіў Смушкевіча. Прывабны чалавек, выдатны лётчык і камандзір», — успамінае генерал-лейтэнант авіяцыі ў адстаўцы мінчанін А. С. Сенатараў.

18 жніўня 1933 года быў апублікаван святочны загад Рэўваенсавета за подпісам К. Я. Варашылава. Першым у ліку лепшых авіязлучэнняў было названа тое, якім камандаваў Смушкевіч. Ён быў узнагароджан Ганаровай граматай ЦВК СССР.

Калі ў 1936 годзе на іспанскай зямлі фашызм развязаў крывавую вайну, у першай групе савецкіх добраахвотнікаў, прыняўшых удзел у барацьбе іспанскага народа супраць сіл рэакцыі, быў Я. У. Смушкевіч.

Якаў Уладзіміравіч унёс вялікі ўклад у будаўніцтва ваенна-паветраных сіл рэспубліканскай Іспаніі, быў адным з ініцыятараў дзеянняў знішчальнай авіяцыі ў начных умовах, што выратавала ад бамбёжак многія іспанскія гарады. Ён распрацоўваў і кіраваў правядзеннем многіх аперацый урадавай авіяцыі, выдатную ролю адыграў у арганізацыі абароны Мадрыда і разгрому італьянскага экспедыцыйнага корпуса пад Гвадалахарай. За мужнасць і гераізм у барацьбе з фашызмам у Іспаніі Я. У. Смушкевіч быў удастоен звання Героя Савецкага Саюза.

На першых выбарах у Вярхоўны Савет СССР у 1937 годзе Я. У. Смушкевіч выбіраецца дэпутатам, а на XVIII з'ездзе партыі — кандыдатам у члены ЦК ВКП(б). У 1937 годзе 35-гадовы генерал Смушкевіч быў назначан намеснікам начальніка ВВС РККА. Ён займаецца распрацоўкай статутаў і кіраўніцтвам па баявых дзеяннях радоў авіяцыі, улічваючы вопыт вайны ў Іспаніі, сустракаецца з канструктарамі самалётаў, удзельнічае ў стварэнні больш дасканалых машын, часта сам выпрабоўвае іх, а ў 1939 годзе ўзначальвае савецкіх лётчыкаў ў баях з японскімі мілітарыстамі ў раёне ракі Халхін-Гол.

Генерал Камацубара разлічваў знішчыць войскі Мангольскай Народнай Рэспублікі на працягу 7—10 дзён. Аднак самураі памыліліся. Пад кіраўніцтвам Смушкевіча ў час генеральнага наступлення, якое пачалося 20 жніўня 1939 года, 600 самалётаў нанеслі незвычайнай сілы ўдар па варожых пазіцыях. Да 1939 года нікому ў гісторыі авіяцыі не даводзілася кіраваць такой вялікай колькасцю самалётаў, адначасова наносіўшых удар па ворагу. У выніку дзесяцідзённых баёў шостая японская армія Камацубары была поўнасцю разгромлена.



*НА ЗДЫМКУ: Я. У. СМУШКЕВІЧ (другі злева) сярод Герояў Савецкага Саюза.*

У верасні 1939 года Я. У. Смушкевічу было прысвоена званне двойчы Героя Савецкага Саюза. У той жа час ён стаў начальнікам ВВС Чырвонай Арміі.

У трывожны перадваенны час Савецкі Саюз павінен быў прыняць сур'ёзныя меры для ўмацавання сваёй бяспекі. Я. У. Смушкевіч удзельнічае ў вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь.

30 лістапада 1939 года пачалася вайна з Фінляндыяй, якая паквапілася на свяшчэнныя рубяжы Краіны Саветаў. З самага пачатку ваенных дзеянняў начальнік ВВС на баявым пасту, часта бывае ў авіячасцях. Калі зусім падвялі ногі (у выніку аварыі самалёта Я. У. Смушкевіч атрымаў шматлікія пераломы), прыкаваны да пасцелі, ён не пакідае кіраўніцтва паветранымі аперацыямі.

У лютым 1940 года была прарвана лінія Манергейма, якую фіны лічылі непрыступнай. Хутка ўрад Фінляндыі запрасіў міру.

Пасля прыёму герояў фінскага фронту ў Крамлі лётчыкі акружылі Смушкевіча, паднялі яго на рукі і беражна панеслі да машыны. Памочнік Я. У. Смушкевіча ў Іспаніі і на Халхін-Голе І. Я. Пранішнікаў успамінае, што Якаў Уладзіміравіч карыстаўся сярод лётнага саставу вялікім аўтарытэтам і любоўю. Пры ўсіх яго заслугах ён заставаўся вельмі простым і нават сарамлівым чалавекам.

...Лётчыкі старэйшага пакалення захоўваюць у памяці сваёй светлы вобраз Я. У. Смушкевіча. Усім жыццём, кароткім, але гераічным, заслужыў ён права на бяссмяроцце. Аб гэтым гаварыў лётчык-касманаўт Савецкага Саюза Г. Берагавы на адкрыцці помніка двойчы Герою Савецкага Саюза Я. У. Смушкевічу.

Многа год прайшло з той пары, калі ў ліку студэнтаў факультэта грамадскіх навук БДУ з'яўляўся на экзамены Якаў Смушкевіч. Але хочацца верыць, што новыя пакаленні студэнтаў Беларускага універсітэта не забудуць імя героя.

**Ц. КЛЯБАНАВА.**
**студэнтка V курса гістарычнага факультэта.**

# АСПІРАНТ



Я ведаю Фёдара Мельніка амаль шэсць год. Многія—значна больш. Але, думаю, каб пазнаць яго, нават не трэба «стажу»—такі ён адкрыты чалавек. Прыветлівасць, злёгку цырымонная галантнасць, заўсёды роўны паважны тон... Пры больш блізкім знаёмстве вы ацэніце яго прамадушша, яго дабрату і чуласць.

Цяпер ён аспірант. Прыйшоў у навуку даволі свядома: яшчэ на другім курсе стаў членам навуковага гуртка, захапіўся тэмай, упершыню адчуў патрэбнасць пошуку. І хоць ён не быў лаўрэатам конкурсаў, усё ж верыў, што калі-небудзь знойдзе «агульную мову» з навукай. Магчыма, гэта зразумелі і яго першы настаўнік Аляксей Арсенцьевіч Волк, які адзначыў схільнасць дапытлівага студэнта да навуковай работы, і члены вучонага савета гістарычнага факультэта, якія рэкамендавалі Фёдара ў аспірантуру.

Нядаўна на аспіранцкай групе абмяркоўвалася яго дысертацыя. «Даследаванне, дастойнае адабрэння,—адзначыў прафесар М. Я. Шкляр. —Мельнік добра папрацаваў. Настойлівы, вызначаецца тонкім уменнем працаваць з матэрыялам».

Дысертацыя Ф. Мельніка прысвечана дзейнасці Кампартыі Беларусі па павышэнню ролі рабочага класа ў барацьбе за завяршэнне сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасці (1933—1937 гг.) Яна напісана на аснове шырокага кола першакрыніц і дасягненняў гісторыка-партыйнай навукі за апошнія гады. Чытаецца з цікавасцю. Прыцягвае ў рабоце глыбіня, лагічнасць, аб'ектыўнасць, даступнасць выкладання. Вазьму на сябе адказнасць адзначыць, што праблема вырашана на сучасным узроўні. Асаблівасць работы ў тым, што яна народжана добрай мэтанакіраванасцю, уменнем аўтара выбраць з мноства фактаў найбольш істотнае. Відаць, у гэтым галоўнае.

Я спытаў у Фёдара, што садзейнічала яго поспеху.

— Мне проста пашанцавала: я аспірант кафедры, дзе працуюць удумлівыя педагогі, сапраўдныя вучоныя... У мяне патрабавальны навуковы кіраўнік Міхаіл Яфімавіч Шкляр, цярпенню якога я зайздрошчу. Асабліва выдзяляю—цярпенню! Бо колькі ён вычытаў варыянтаў, перш чым нарадзіўся канчатковы... Здзіўляюся яго ўменню весці людзей у навуку.

Што датычыцца майго «распарадку», то ён такі ж, як і ва ўсіх.

Але тут трэба зрабіць дапаўненне. Сакрэт яго «метаду» працы—настойлівасць, уменне выкарыстаць кожную хвіліну. Усё ён паспявае зрабіць: пабываць у архіве і тэатры, правесці гутарку з рабочымі завода і наведаць сяброў, прачытаць новую кнігу і з'ездзіць у басейн.

— Я часта задаваў сабе пытанне,—дзеліцца сваімі ўражаннямі яго таварыш па вучобе І. Рамаaccount—адкуль у яго гэтае ўменне займацца сур'ёзна любой справай? У Фёдара не бывае «дробных» спраў, якія можна адкласці на заўтра.

...Адначасова і парторг, і прапагандыст, і дысертацыя пішацца. А пазней зразумеў: гэта праяўленне яго ўнутранай сабранасці і самадысцыпліны.

Гэтыя задаткі Фёдара Мельніка закладзены яшчэ з дзяцінства. Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Рана страціў маці, нямала дасталася клопатаў з малодшым братам. Раней сваіх равеснікаў пазнаў, што такое сапраўдная праца. Ва універсітэт прыйшоў пасля арміі.

Тыя, з кім вучыўся Ф. Мельнік, паважалі яго за прамату характару, працавітасць і чалавечнасць.

Мне ўспамінаецца студэнцкая цаліна 1966 года. Ён быў любімцам атрада. Да яго ішлі за парадай, прапаноўвалі прачытаць лекцыю ў мясцовым клубе, выступіць за зборную па футболу. А неўзабаве Фёдар аднадушна быў выбран заўгасам замест таварыша, які не спраўляўся. Ён адразу ж наладзіў справу: своечасова забяспечваў атрад прадуктамі, палівам, інструментамі, будаўнічымі матэрыяламі, адначасова працуючы разам з усімі.

Атрад «Вікторыя» заняў тады першае месца ва Уральскай вобласці сярод студэнцкіх атрадаў і быў удастоен чырвонага сцяга. Гэтая «цаліна» запомнілася. Ветэран Мельнік і яго таварышы сваёй кіпучай энергіяй раскрылі мне, першакурсніку, сутнасць высакароднага патрыятычнага парыву студэнтаў, якія ў час канікул едуць у спякотныя стэпы Казахстана і ў суровыя раёны Крайняй Поўначы.

...Для Фёдара свет складаны і шматвымяральны, увесь пранізаны праблемамі і прыгажосцю. Ён сам шукае іх і знаходзіць усюды: і ў мудрагелістай архітэктуры старажытных помнікаў, і ў спрадвечным імкненні чалавека да ведаў, і ў паўсядзённай працы. Такі гэты чалавек.

**П. БОНДАР.**

НАШ КАЛЯНДАР

# ВЯЛІКІ АСВЕТНІК І ГУМАНІСТ

7 мая споўнілася 110 год з дня нараджэння вялікага пісьменніка, асветніка і грамадскага дзеяча Індыі Рабіндраната Тагора. Імя гэтага чалавека вядома ва ўсіх кутках зямнога шара. Дзякуючы яго творам, якія, па словах А. В. Луначарскага, «так поўны фарбамі, танчэйшымі духоўнымі перажываннямі і сапраўды вялікімі ідэямі, якія складаюць цяпер адну са скарбніц агульначалавечай культуры». Чытаючы творы Тагора, мы пазнаём духоўны свет індыйскага народа, яго багатую культуру, глыбей пазнаём яго мінулае і цяперашняе.

Творчасць Рабіндраната Тагора была непарыўна звязана з акружаючай яго рэчаіснасцю. У цяжкі час каланіяльнага панавання Тагор выступаў за захаванне самабытнай культуры індыйскага народа і ў той жа час за засваенне Індыяй перадавых дасягненняў навукі і лепшых узораў культуры, створаных чалавецтвам, бачыў у гэтым шлях ад векавой адсталасці да росквіту сваёй краіны. Рабіндранат Тагор нам дарагі і за тое, што ў яго раманах, апавяданнях, вершах і п'есах, акрамя вялікай любві да сваёй радзімы, мы бачым глыбейшую павагу да ўсіх народаў свету. Мы шануем яго за высокі гуманізм, за імкненне дапамагчы ўбачыць чалавеку сваю веліч і сілу.

Рабіндранат Тагор быў шчырым сябрам Савецкага Саюза. Ён наведаў СССР у 1930 годзе. Гэты прыезд Тагора мае сапраўды гістарычнае значэнне — ён адыграў важную ролю ў развіцці савецка-індыйскіх адносін і, па сутнасці, паклаў пачатак дружбе савецкага і індыйскага народаў. Шматлікія публіцыстычныя выступленні Тагора, яго пісьмы, якія ўвайшлі ў цудоўны публіцыстычны твор «Пісьмы аб Расіі», паказваюць нам, якое вялікае ўражанне аказала на Тагора Савецкая Расія.

Ужо зусім хворы, незадоўга да сваёй смерці, у ліпені 1941 года Тагор гаварыў аб сваёй цвёрдай упэўненасці ў перамозе савецкага народа над фашызмам.

Сваёй творчасцю Тагор не толькі «перакінуў масты» паміж старажытнай індыйскай культурай і культурай Індыі адраджэння, ён звязаў усіх людзей свету, якія змагаюцца супраць вайны, яшчэ адной моцнай ніткай.

Рабіндранат Тагор марыў аб шчасці сваёй радзімы. Ён заклікаў да адзінства і згуртаванасці ўсёй шматнацыянальнай Індыі, незалежна ад расавай, моўнай або рэлігійнай прыналежнасці яе народаў. У гэтым ён і бачыў аснову будучага эканамічнага і культурнага росквіту краіны. Аб гэтым спяваецца ў цудоўнай песні Тагора «Джана гана мана», стаўшай сімвалам рэспублікі Індыя. Для пераадолення шырокай непісьменнасці народных мас Тагор прапаноўваў стварыць шырокую сетку нацыянальных школ і універсітэтаў. Сам Тагор на свае сродкі стварыў у 1919 годзе ў Шанцінікетоне універсітэт. Шляхі да пад'ёму індыйскай вёскі ён бачыў у каапераванні сельскай гаспадаркі.

Рабіндранат Тагор лічыў, што толькі мірная і незалежная палітыка, супрацоўніцтва з іншымі народамі стануць трывалай асновай прагрэсу і росквіту яго краіны. Гэтыя мары Тагора і цяпер натхняюць лепшых людзей Індыі.

**С. ПЯТКОЎСКІ,**
**студэнт I курса факультэта журналістыкі.**



*Танцавальны калектыў «Крыжачок», эстрадны ансамбль і іншыя універсітэцкія самадзейныя калектывы ў дні святкавання 26-й гадавіны перамогі над фашысцкай Германіяй выступілі з шэфскімі канцэртамі.*

*НА ЗДЫМКАХ: (справа) кіраўнік танцавальнага ансамбля М. В. Лапша дае апошнія настаўленні сваім выхаванцам; (ніжэй) група рабят выконвае гуцульскі танец; (злева ўверсе) салісты Я. Яловічава і А. Дзегцяроў выконваюць малдаўскі танец.*



# З ШЭФСКІМІ КАНЦЭРТАМІ



*Сонечны ўкраінскі «гапак», вясёлы рускі, іскрысты малдаўскі танцы змяняліся адзін за другім, і гарачыя апладысменты сустракалі наш ансамбль. І, вядома, не толькі танцы ў гэты святочны вечар радавалі гледачоў. Кранаюча прагучала песня «Табе, зямля». Вельмі цёпла былі сустрэты песні «Алёшкіна каханне» і «Не проста быць удваіх».*

*Фота Л. ЦІТОВАЙ.*



# НАВІНКІ ВЫДАВЕЦТВА БДУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).*

Кніга ўяўляе цікавасць для студэнтаў-філолагаў, выкладчыкаў і ўсіх, каго цікавяць пытанні гісторыі рускай літаратуры.

**Стральцоў Б. В.** Газета і мараль.

У кнізе асвятляецца шматгранная работа камсамольскіх газет Беларусі па фарміраванню маралі маладога савецкага чалавека. Разглядаюцца прыёмы і метады прапаганды кодэксу камуністычнай маралі, вызначаецца своеасаблівасць распрацоўкі гэтай тэмы на старонках друку нашых дзён.

Кніга адрасуецца работнікам друку, прапагандыстам, студэнтам-журналістам і шырокаму колу чытачоў.

**Супрун А. Е.** Лекции по языкознанию.

У кнізе разглядаюцца асноўныя функцыі мовы як важнейшага сродку чалавечых зносін і паказаны некаторыя шляхі выканання гэтай функцыі. Даецца характарыстыка прыёмаў даследавання лексікі і граматыкі, а таксама асвятляецца пытанне аб характары і прычынах змен у мове. Заключная лекцыя прысвечана тэарэтычнаму і практычнаму значэнню навукі аб мове.

Кніга з'яўляецца дапаможнікам для студэнтаў, вывучаючых агульнамовазнаўчыя курсы.

**Цаленчук С. О.** Анализ языка литературного произведения.

У брашуры разглядаюцца шляхі і прыёмы вывучэння лексіка-фразеалагічных і граматычных асаблівасцей моўнай будовы ў мастацкіх творах розных жанраў, у публіцыстычнай літаратуры. Прыцягваецца разнастайны ілюстратыўны матэрыял з твораў рускіх і савецкіх пісьменнікаў, з прац У. І. Леніна. Брашура адрасавана студэнтам у якасці дапаможніка пры напісанні курсавых і дыпломных работ лінгвастылістычнага характару, а таксама настаўнікам-славеснікам і ўсім, хто цікавіцца вывучэннем мовы мастацкай і публіцыстычнай літаратуры.

# СТВАРАЛЬНІКІ «ЛЕГЕНДЫ» — ГОСЦІ СТУДЭНТАЎ

*Нядаўна студэнты філалагічнага факультэта прымалі гасцей — творчую групу стваральнікаў кінафільма «Легенда». Дырэктар творчага аб'яднання «Край» Анджэй Ваятэк і польскі кінадраматург і гісторык Збігнеў Залускі расказалі аб сумеснай рабоце Вроцлаўскай кінастудыі і кінастудыі «Масфільм». Апладысментамі сустрэлі студэнты і выкладчыкі выступленні выканаўцаў галоўных ролей—маладых польскіх акцёраў Малгажаты Патоцкай, Ігара Страбужынскага і савецкага акцёра Мікалая Бурляева, вядомага па многіх фільмах.*



*НА ЗДЫМКУ: (злева направа) М. Патоцка, М. Бурляеў і І. Страбужынскі.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

## Паэтычны куток

**Леанід АНОП**

### ЧОРНЫЯ БУСЛЫ

Гляджу услед...
Гляджу, нямею.
І цэлы дзень жыву без слоў.
Я і цяпер не разумею,
Чаму шкадую тых буслоў.
Тых памяркоўных
І забытых,
Тых чорных — можа ад бяды?—
Што цэлы дзень шукаюць, быццам,
Гаючай,
Як бальзам,
Вады.
Што кружаць, сумныя, над полем
І рэдкім крыкам нас вітаюць.
Баюся не сустрэць іх болей —
Буслы ў вырай адлятаюць.
А за спагаду ім,
за мукі,
За вернасць, што ў душы
збярог,
Мне на абветраныя рукі
Упала
Чорнае
Пяро.

**Марыя ЦІХАНОВІЧ**

### БЕЛІЦА

Беліца, Беліца...
У свеце крупінка.
Луг за аселіцай,
У полі калінка.

Беліца, Беліца...
Ранкам ці ўночы
Белай мяцеліцай
Сыпле у вочы.

У квецені Беліца,
У сінім світанні,
Сонцам праменіцца,
Звоніць чаканнем.

У полі трапечацца
Сцежка да хаты.
Вёсачка Беліца —
Роднае свята.

* * *

Падтрымай, калі лёд пад нагамі,
Калі цемрай дарога спавіта.
Не трымай, калі шчасце снапамі,
Нібы спелае, цяжкае жыта.

Уцяшай, калі вербы завялі,
Калі рэкі да дна апусцелі.
Не ўцяшай, калі росы заззялі,
Калі рукі матулі сагрэлі.

Падыдзі, калі душыць спякота,
Калі сэрца згарае ад жалю.
Не ідзі, калі сцежку для ўзлёту
Мае вочы ўжо адшукалі.

Рэдактар
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Тыраж 2000 экз. Зак. 614. АТ 09724